Аляксандр Ярашэвіч

# Археаграфічныя звесткі пра Мірскі замак з архіва Радзівілаў

Інвентары Мірскага графства ў складзе Архіва Радзівілаў знаходзяцца ў варшаўскім Archiwum Głownym Akt Dawnych (мікрафільмы ў НГАБ, Мінск, КМФ-5). Гэтыя эканамічныя матэрыялы датычаць мястэчкаў Міра, Свержаня і 11 навакольных сёл, даюць спісы падданых, іх павіннасцей і мала пішуць пра замак, больш увагі аддаючы фальварку. Самы ранні інвентар 1644 г. пералічвае толькі рэчы хатняга побыту: у фальварку – "стары кацёл на 3 цэбры, скрыня шкла і 2 камені волава, прывезеныя з Нясвіжа (камень=10–30 фунтаў), далей – "20 сталоў розных у замку, у т. л. 1 каменны, 18 зэдляў вялікіх, 7 зэдлікаў адзіночных, 6 ложкаў; 14 бочак піўных, 8 кадзі гародніных, 1 малая кадка, 1 чоп мерны, 1 квасьнік, 1 кадка, 2 корцы піўныя, 1 чарпачка, 1 цэбар, 1 замок унутраны. Тое ўсё начынне знаходзіцца ў замку. На вежы зэгар спружынны, звон адзін, а механізм да яго няпоўны, нехапае некалькі дэталяў"[1].

У пачатку верасня 1654 г. казакі Залатарэнкі занялі Мір і разбурылі дашчэнту, да чаго прыклалі руку і мясцовыя. В. Калнін згадвае "рэестр прычыненых шкод у графстве Мірскім людзьмі з маёнтка Турэц" і інвентар замка 1660 г.: "Сам замак рамонту і нагляду патрабуе, усюды цячэ, вокны, дзверы, лавы зрэдку дзе ёсць, па ўсіх пакоях вышніх і сярэдніх, а таксама ў сутарэннях дзвярэй і вокнаў няма. У замку засталося 35 мушкетаў, адна гакаўніца, пяць жалезных дзвярэй у сховішчы і адны падвойныя да склепа, адно кавадла і адзін замкавы кацёл"[2].

Інвентар 1681 складзены па загаду Катажыны з Сабескіх Радзівіл (1634–1694) пасля смерці мужа, падканцлера Міхала Казіміра. Са 105 яго старонак апісанне замка займае крыху больш адной. "Уязджаючы ў замак ад места брама мураваная паўкруглая, каменем шэрым чэсаным вакол варот абкладзена. Вароты двухстворкавыя, з дошак, сталярскай работы, на бягунах (палазах – А.Я.), з форткай (дзверцай) на дзвюх завесах, пры ёй жалеза вісячае для замыкання з двума прабоямі, самі вароты закладаюцца дубовым брусам, які ўваходзіць у два клямры ў канцы і пасярэдзіне, там жа жалеза для замыкання, якое праходзіць праз брус, і вісячая калодка. У той браме па правым боку пакой з дошак для варты, уваход у які праз дзверы на бегунах, у сені такія ж і да пакойчыка, у якім пасярэдзіне печ кафлявая зялёная і акно са шклом адно, з дрэва зробленае. Над той першай брамай даху няма, толькі мур гонтамі накрыты, а з сярэдзіны ў кола ідуць старыя зломкі. Уваходзячы з той брамы да другой мураванай, са скляпеннямі, на другім паверсе розныя памяшканні і вежа з гадзіннікам, узвод (пад'ёмны мост) дубовы, трыма жалезнымі пасамі ўпоперак сцягнуты, і два пасы ў канцы яго, там жа два канцы ланцугоў. У адным звенняў 17, а ў другім 16 з кольцамі, да таго ж

узводу два кольцы ў муры, праз якія ланцугі хадзілі. У тую браму другія вароты дубовыя двайныя на бягунах, адна створка ляжыць у зямлі і шмат дошак на завесах. У той другой браме па левым боку за варотамі турма, дзверы да яе на завесах, з зашчапкай вялікай. Каля той турмы другія дзверы з адным завесам, уваход праз якія ў пакой са скляпеннем, дзе раней была мураваная кардэгарда. Крата на акне ўся жалезная ў той браме. З другога боку дзверы на завесах з крукамі пад зэгар, ад іх угору ідуць драўляныя папсаваныя сходы (лесвіца), пад той брамай склеп у зямлі мураваны, дзверы да яго засыпаны. Увайшоўшы ў сам замак, ідучы па левым боку дольнымі склепамі, дзверы на завесах да мураванага пакою, ён заняты складам Пана ваяводы смаленскага, і ўсе іншыя дольныя склепы закрыты замкамі і ключамі Пана ваяводы, якіх не адчынялі, і што ў іх мурах робіцца, не спісвалі. Сярэднія пакоі таксама ўсе пазайманыя рознымі рэчамі таго ж Пана ваяводы, а верхнія амаль усе пайшлі ў руіну і патрабуюць хуткай рэстаўрацыі”[3].

Намінальным смаленскім ваяводам у 1677–1687 гг. быў Крыштоф Есьман, аднак Смаленск рэальна ўжо не належаў Рэчы Паспалітай, таму, відаць, і склаў Есьман свае рэчы ў Мірскім замку. У ліпені 1686 г. “Палац і фальваркавыя будынкі не апісваюцца, таму што яшчэ ўсюды не закончана рэстаўрацыя”[4]. Паводле В. Калніна, найбольш інтэнсіўна работы вяліся ў 1686–1689 гг., ім жа згадваюцца майстры: слесар са Слуцка, маляр з Турца, сталяр Ярмаловіч з Сімакава.

У час Паўночнай вайны канцлер Караль Станіслаў Радзівіл спрабаваў лавіраваць паміж саксонскім і шведскім лагерамі. 21 снежня 1705 г. ён прымаў Пятра I у Карэлічах. 27 красавіка 1706 г. замак спалілі шведы. Апісанне 1712 г. Мірскага двара, “нова рэстаўраванага па спаленні шведскім”, упамінае “жалеза living рознае” на новамураваную званіцу пры фарным касцёле. Замак не апісваецца, відаць, не было што перапісваць[5]. Канцлер памёр у 1719 г., Ганна з Сангушкаў з малымі дзецьмі засталася ўласніцай мноства разрабаваных маёнткаў. Паводле інвентара 1719 г. Мірскага замка “ўсе пакоі зруйнаваныя і пустыя, ва ўсіх няма ні дзвярэй, ні жалеза, таксама няма ніводнага акна... Усе афіцыны адны гонтам, другія дахоўкамі накрыты...” Засталіся дэталі гадзінніка, запушчанага ў 1686 г. Звон растапіўся на 9 кавалкаў[6]. У 1720 г. пачалі аднаўляць замак, але прыпынілі, аддаўшы прыярытэт Нясвіжу. Ганна, магчыма, яшчэ пры жыцці мужа занялася гістарычнымі партрэтамі сямейства Радзівілаў. Жыла яна пераважна ў Бялай, часам наязджала ў Мір, але наўрад ці спынялася ў замку. Апісанне Мірскага замка 1720 г. практычна нельга прачытаць[7]. Інвентар графства 1725 г., складзены Юрыем Бяліковічам, камісарам ад Ганны з Сангушкаў, звестак пра замак не змяшчае[8].

Апісанне Мірскага двара (не замка) 18.12.1726 г. упершыню сярод рэчаў згадвае партрэтаў 17, сталоў усіх 25, крэсел панскіх 24, крэсла старое ў свірне 1, ложкаў – 22, зэдляў вялікіх – 8, зэдлікаў малых 48... Да палаца

замкавага вокны новыя; новых робленых у волава апраўленых 28, рам да замкавых вокан алавяных 3. Акно без завесаў з кручкамі. Дзвярэй жалезных да замка 2. Усё гэта, як можна зразумець з тэксту, знаходзілася яшчэ ў двары. Вядзецца падрыхтоўка да рэстаўрацыі замка: упамінаюцца дзве цагельні, у адной з іх – форма для вырабу даховак з карпавай лускою. Абпаленай цэглы ў абедзвюх цагельнях – 50 тыс., неабпаленай – 18 тыс., дахоўкі абпаленай 23 500 [9]. Інвентар графства Мірскага 24.04.1727 г. згадвае цагельні і вапельні. На л. 2 пададзена "Спецыфікацыя розных рэчаў": "застаецца партрэтаў у будынках (у двары – А.Я.) семнаццаць", далей пералічваецца простая мэбля: тапчаны і да т.п. [10].

У 1736 г. пры перадачы графства Мірскага Міхалу Радзівілу, кашталяну Троцкаму, упамінаюцца дзве цагельні, цэглы ў іх абпаленай – 60 тыс., неабпаленай – 8 тыс. Апісанне будынкаў фальварка Мірскага указвае 30 тыс. цэглы [11]. Паводле В. Калніна, Мірскі замак быў адноўлены толькі ў 1738 г. Пры гэтым на трэцім паверсе палаца з'явіўся парадны пакой, партрэтная зала, зала для танцаў. У іх "неадменна печы і каміны, ляпная столь з пазалотай, паркет у малых і вялікіх квадратах, дзвер філёнкавыя з унутраным французскім замком. Усяго мелася 16 камінаў і 17 печаў з карычневай, жоўтай і белай кафлі" [12]. Няясна, да якой даты адносяцца звесткі, таму што інвентары 1737–1738 гг. апісваюць толькі фальварак[13].

Інвентар 1747 г. Мірскага графства з фальваркам займае 165 старонак. Арандаваў яго ў Міхала Казіміра на 3 гады пісар ВКЛ Антоні Пшаздзецкі. Згадваюцца два млыны: пад местам і пад замкам, цагельні ў Любне і Аталезі (яўна, згаданыя раней). Дасканала апісана тапаграфія Міра, даецца вопіс вуліц з пляцамі і жыхарамі. Пры ўездзе ад замка стаяла мураваная брама, на рынку – пасярэдзіне 2 крамы мураваныя з піўніцамі мураванымі, далей ратуша мураваная (У. Сыракомля пісаў: "Ніхто не ведае, каб была ратуша"), 12 крамаў скляпёных, 6 мураваных калон, на адной з брамаў – арол маляваны гербавы...[14]. Але нічога не сказана пра замак, таму што ён не належаў да арэнды.

Пасля жаніцьбы ў 1753 г. з Любамірскай у замку быў паселены Караль Радзівіл Пане Каханку, вядомы экстравагантнасцю, хаця мемуарысты нямала і дапісалі яму ўсялякіх учынкаў. Інвентар 1757 г. датычыць двара і месца Міра, у ім не праглядваецца нічога значнага адносна замка. У 1764 г. Пане Каханку аказаўся ў апазіцыі да новага караля, вымушаны ўцякчы за мяжу, а ўладанні ўзяты ў скарб. Пасля рэабілітацыі Караля Станіслава і звароту маёнткаў быў зроблены ў 1778 г. адзіны вядомы нам дакладны вопіс планіроўкі замка, апублікаваны на мове арыгінала В. Мікульскім і Я. Завадскім [15]. Улічваючы яго інфармацыйную каштоўнасць, падаем беларускі пераклад.

"Інвентар перадачы ўсякіх астаткаў (remanentow) у фальварках графства мірскага, якія засталіся circa funda пасля вяльможнага Пана з

Канопіцаў Грабоўскага, палкоўніка войск В.К.Літ., з апісаннем драўлянай забудовы і муроў пры перадачы паводле дэкрэту найсветлай камісіі апошняй інстанцыі па рэабілітацыі (ultimae instantiae per rehabilitationem) у валоданне князям: Каралю, ваяводзе віленскаму, і Геранімy, ардынату алыцкаму, Радзівілам, дзедзічам. У гэтым 1778 годзе м-ца жніўня 8 дня складзены. У канцы на л. 45 прыпіска: Да таго інвентара падаўчага графства мірскага пры лісце перадачы, выданым мною князям іхмосьцям Радзівілам, ваяводзе віленскаму і ардынату олыцкаму (Рэестр прадметаў, якія не праверaны, а знаходзяцца ў скарбцу мірскім замкавым, і прадстаўлены панам Юзафам Перкінам, маркграфам замку мірскага і пададзены да запісу, запісаўшы) падпісваюся. Пісаны ў Міры году 1778 м-ца жніўня 8 дня Ігнацы Гарабурда, суддзя гродскі, стараста наваг(рудскі)”. /Рэестру скарбца пры інвентары няма/.

**Апісанне сітуацыі замка Мірскага**

ЗАМАК з прыезду ад Нясвіжа размешчаны пад местам, абведзены вакол насыпным валам, муру старасвецкага, здаўна вымураваны вялікай структурай з чатырма па вуглах вежамі і пятай над брамай ад места, у якой зэгар вялікі, з боем, цяпер папсуты, у тры паверхі, апрача склепаў, да якога з уезду ад места у прымурку ў круг БРАМА. У ёй вароты падвойныя старыя, з выламанымі дошкамі, на бягунах (палазах). Уверсе кругавога прымурку драўляная ГАЛЕРЭЯ перад капліцай, у кола пад старым дзюравым гонтавым дахам, у самой браме пад вежай вароты старыя падвойныя, на бягунах. Не выходзячы, у левым баку (с. 2) КАРДЫГАРДЫЯ, да якой дзверы простыя, з зашчапкай і прабоямі, акно адно, без шкла, з жалезнай шчыльнай кратай. Печ з цэглы змураваная, з дзядзінца ўлева да сяней пякарні дзверы простыя на адным толькі завесе і круку, акно з кратай жалезнай, палова зверху са шклом з адных кавалкаў, у дрэва апраўленае. З сяней да пякарні дзверы звычайныя, на завесах. Акно адно, з кратай, без шкла, печ з кафель зялёных, разваленая, пякарная, з цэглы, цэлая. У першым паверсе ад вугла да пакою вялікага са скляпеннем дзверы простыя (з) замком, на завесах, з зашчапкай, з прабоямі. Вокны ў ёй два з кратамі, адно зверху напалову са шклом у вялікія шыбы. У тым пакоі печ з шэрых кафель рассыпаная, БАКОЎКА цёмная для складу, да якой дзверы на завесах, у корабе прабой. Выходзячы з пакоя, у рагу памяшкання на ўваходзе да сенцаў дзверы на завесах без зашчапкі, з прабоямі, праз сенцы ўверх дзверы на завесах да памяшкання ці бастыёну, унутры два акенцы без рам і шкла. Печ з шэрых кафель распаленая (?), пад тым бастыёнам склеп без дзвярэй, з дзвума вакенцамі без шкла. Памінуўшы ступені каменныя перад усходамі наверх СКЛЕП на тры (камеры) перамураваны, ад дзядзінца дзверы падвойныя, на завесах, з засоўкай жалезнай. Сходы ўніз са ступенямі паруйнаванымі, дзверы з сярэдняга ў баках да абодвух на завесах, пры адных зашчапка, у абодвух па два акны з кратамі. Далей у тым паверсе СПІЖАРНЯ (сталоўка – А.Я.), дзверы да яе

адзінарныя, на завесах, з зашчапкай. Вакны два, з кратамі, без печы, за спіжарняй ЦУКЕРНЯ з дзвярамі на завесах, з зашчапкай, вокнаў унутры два з кратамі, адно і са шклом, але зусім пабітым. Печаў пекарняных з цэглы дзве. За цукерняю ў рад: зноў СКЛЕП, да якога дзверы падвойныя на завесах, круках з засоўкай жалезнай і прабоямі, на тры перамураваны, да аднаго і другога дзверы на завесах з зашчапкамі і прабоямі, у адным з іх акно з кратай, а другое замуравана; (с. 3) у другім два вакны з кратамі, у рагу той жа лініі АРСЕНАЛ, дзверы да яго паламаныя, з адным завесам, з зашчапкай і прабоямі, у ім у абодвух баках БАКОЎКІ, а ў рагу БАСТЫЁН з двума вакенцамі без шкла. Адтуль ад рогу КРЭДЭНС (буфетная), да якога дзверы на завесах, з зашчапкай і прабоямі, окно адно з жалезнай кратай, печ з кафель зялёных і камін кутавы разбіты. За ім, памінуўшы ступені перад усходамі наверх, каменны СКЛЕП, у якім знаходзяцца даўнія напоі, да яго дзверы падвойныя, жалезныя, на завесах, з дзвюма зашчапкамі і прабоямі для замкоў przywiernych (навесных? – А.Я.), належныя сходы са ступенямі на дол, там чатыры склепы перамураваныя, з першага а ў левым баку два, да якіх простыя дзверы на завесах, з зашчапкамі, у сярэдзіне па аднаму вакну з жалезнымі кратамі, з першага ўправа да аднаго склепу дзверы на завесах з зашчапкай і прабоямі, вокан у ім два з кратамі. Проста далей СКЛЕП ВЕРХНІ З БАКОЎКАЙ для складання зброі, да яго ад дзядзінца дзверы жалезныя папсутыя, на завесах, з зашчапкай і двума ў корабах да бакоўкі простых дзвярах на завесах, з зашчапкай і прабоямі, вокан два з кратамі жалезнымі. За тым КАРДЭГАРДЫЯ з былой бакоўкай без дзвярэй, гноем запушчанай, вокан два ў бакоўцы, трэцяе з кратамі. Печ пакаёвая з цэглы змураваная. За той (кардэгардыяй) СКЛЕП з дзвярамі для ўваходу на завесах падвойных з засоўкай жалезнай і прабоямі, сходы ўніз са ступенямі паруйнаванымі, перамураваны на тры, з сярэдняга ў левы бок дзверы на завесах з зашчапкай і кратамі ў акне адной, да другога ўправа корабы без дзвярэй, два акны без крат. На вавароце з вугла замураванне без даху для складання дроў, з яго ў кут СКЛЕП верхні без дзвярэй, у якім вокан без шкла два з кратамі, з таго далей БАСТЫЁН без дзвярэй, у ім два вакенцы малыя без рам і шкла, печ з зялёнай кафлі ўся рассыпаная, вярнуўшыся адтуль СТАЙНЯ ўнізе, да яе з дзядзінца (с. 4) двайныя вароты з бягунамі, уся забрукаваная. Жалабы па абодвух баках старыя параскіданыя, вокан з аднаго боку шэсць, з іх чатыры з жалезнымі кратамі, з другога да кухні таксама чатыры з кратамі, у абоіх канцах па вуглах каміны вялікія для абагрэву зімой. У адным і другім канцы МАШТАРНІ (памяшканне для конюхаў) – дзверы на бягунах з зашчапкамі, па аднаму акну з кратамі, у тыл са стайні на дарогу падвойныя вароты, абшытыя дошкамі, збітыя жалезнымі цвікамі, на бягунах, з папярэчнай завалай для замыкання. За стайняй КУХНЯ, да сяней якой (дзверы) простыя на завесах, у ёй два вакны са шклом пабітым. Печ крыжовая пакаёвая з зялёных кафель, пякарная з цэглы змураваныя, да самой

кухні двухстворкавы кораб без дзвярэй. Кухня на шасці мураваных слупах з комінам прасторным, выведзеным над дахам, ачаг таксама пад комінам увесь мураваны. Вокан ад дзядзінца чатыры, шкло пабіта. У канцы за кухняй СПІЖАРНЯ, без дзвярэй. Акенцаў у ёй малых два, без шкла. Ад вугла к браме КУЗНЯ, вароты з дошак падвойныя, цалкам раскіданыя, на бягунах, вакно ў ёй адно з кратай, палова скляпення абвалена. З яе у бок брамы пакой з дзвярамі на завесах, два акны з вуліцы з кратай ад падворку, шкло аднаго зусім пабітае. Печ крыжовая пакаёвая з зялёных кафель, разпалена (?) ўся, пякарнявая з цэглы. Павярнуўшы назад ад брамы к вуглу ўсходы наверх, ступені іх месцамі паруйнаваныя, дзверы да пакоя ў бастыёне філянговыя паламаныя на завесах, вокан тры без шкла, толькі з рамамі. Печ з зялёных кафель з белымі пасамі і камін вуглавы, падлога цэглямі акантавана. Ідучы калідорыкам на браму КАПЛІЦА, уваходныя дзверы да яе і насупраць другія да пакояў на завесах, вокан тры, шыб вялікіх, апраўленых у дрэва, моцна пабітых. Алтар святога Крыштофа разны, лаўкі і вакол дубовая аблямоўка (с. 5) З дзядзінца ў левым баку крутыя ўсходы на другі паверх з належнымі ступенямі аж да сяней, у якіх два вакны ад дзядзінца, з вялікімі шыбамі чыстага шкла, апраўленымі ў дрэва, вельмі многа пабітых, ад вуліцы акно адно меншае, са споду дошкамі забіта, угары трымаецца пабітае шкло. Управа к вуглу ПАКОЙ, да яго з сяней дзверы падвойныя філёнгавыя з дубу, на завесах. з унутраным замком, ключом да яго, з жалезнымі засоўкамі угары і унізе, два вакны з пабітымі шыбамі, падлога з дошак, высокая печ з зялёных кафель і камін кутавы. Побач другі ПАКОЙ, да якога такія ж дзверы, печ такой жа формы, акно адно, падлога з дошак. З яго у кут да бастыёну сенцы, дзверы адзінарныя на завесах з зашчапкай, вокан унутры два. Вярнуўшыся назад праз сені, дзверы да пакою падвойныя такой жа работы, як вышэй, два такіх жа вакны з пабітымі шыбамі, печ і камін такія ж, падлога з дошак. Улева з яго ПАКОЙ бочны, да якога падвойныя дзверы таго ж фасону, печ не адрозніваецца, акно адно, у канцы туалет (PREWECIK), да яго адзінарныя дзверы на завесах з зашчапкай. Далей наступны пакой, уваходныя дзверы, у ім печ, камін і падлога такія ж, два акны з выбітымі шыбамі, з яго ўлева ПАКОЙ з дзвярамі, падлогай, печчу і камінам такімі ж як у іншых, акно адно, у ім туалет (PREWET), які мае дзверы на завесах; выходзячы з першага (пакою) ў сені дзверы падвойныя з унутраным замком без ключа, у сенях акно адно, каморка перад печчу з дзвярамі на завесах, з іх сходы ўніз, а другія акруглыя крутыя наверх. З сяней далей прама ПАКОЙ, які мае дзверы таго ж фасону з унутраным замком і засоўкамі, вокан два, печ зялёнай кафлі з белымі пасамі і камін, улева ПАКОЙ бакавы, дзверы, печ і камін такія ж, акно ў ім адно з шасьці шыбаў аркушовых, з яго зноў улева КАБІНЕТ, які мае двое дзвярэй наскрозь, а трэція да сяней, аднолькавага дрэва і работы, вакно адно з работай са шклом як у іншых, выходзячы, з першага далей да сяней перад скарбцам (с. 6) такія ж дзверы. З сяней да скарбцу дзверы

футраваныя (абшытыя – А.Я.) жалезнымі цвікамі паасобна, на завесах, з замком унутраным, зашчапкай і прабоямі, у ім акно адно з кратай і шклом. Улева з таго ж (скарбцу) да другога дзверы на завесах з клямкай, слюсаком і жалезнай зашчапкай, акно адно з кратай і шклом, з яго ў рог да бастыёну кораб без дзвярэй, у якім (бастыёне) акенцаў малых два без шкла, вярнуўшыся назад з сенцаў, пакой СТАЛОВЫ, да яго дзверы падвойныя з замком унутраным, папсутым, вокан ад дзядзінца два, а трэцяе ў тыл, усе без шкла, печ і камін як у іншых (пакоях). З гэтага пакою далей дзверы такія ж, як папярэднія, да СЯНЕЙ, у якіх вокан без шкла два, сходы з іх уніз адны, а уверх другія, у іх (сенях) каморка для рэчаў, да яе дзверы адзінарныя на завесах з зашчапкай і прабоямі. З сяней прама ПАКОЙ, дзверы, як усюды, печ і камін, вокан без шкла два, падлога з паркету. Унутры (Intus) ПАКОЮ дзверы аднатыпныя з замком і адной засоўкай, вокан два з шыбамі пабітымі. Печ і камін такія ж, як па ўсіх (пакоях), падлога паркетам вымашчана, улева з таго пакою бакавы (пакой), дзверы да яго падвойныя з унутраным замком і ключом да яго, а таксама засоўкамі, печ з зялёных кафляў, акно адно, падлога з дошак, з яго (пакою) да прысенцаў каморных і да самой каморы двое адзінарных дзвярэй на завесах, адны з кручком, а другія (з) зашчапкай і прабоямі, з каморы да сяней дзверы падвойныя з замком і засоўкамі. Вярнуўшыся назад, далей у канец, ПАКОЙ да ўваходу і з яго да сяней двое дзвярэй аднолькавых. Акно ў ім адно з пабітымі шыбамі, печ распаленая(?) ўся і камін, падлога з цэглы. Побач у канцы ПАКОЙ, дзверы ўваходныя, такія ж, як у іншых, акно адно, печ і камін іншыя. Адтуль да сенцаў і з сенцаў да бастыёну двое дзвярэй на завесах з зашчапкамі і прабоямі, унутры два акенкі без шкла і рам. Вярнуўшыся назад з першага (пакою?) к дзядзінцу, ПАКОЙ з дзвярамі на завесах, падвойнымі, два вакны з цалкам пабітым шклом, камін кутавы, а падлога з цэглы. З таго (пакою) дзверы да сяней, адной меры і работы (с. 7), два вакны з пабітымі шыбамі, сходы ўніз.

По трэцяе, ад канца пачаўшы па сонцу, ідучы сходамі ўверх на трэці паверх, сені, у якіх два вакны з адной пабітай шыбай, падлога з цэглы і паркету, управа з сяней першы ПАКОЙ, дзверы да яго дубовыя, работы філянговай, на завесах французскіх, з унутраным замком, з засоўкамі ўверсе і ўнізе, у ім два вакны з адной выбітай шыбай. Печ з кафлі кававай і кутавы камін, столь (суфіт) папраўлена і пабелена, падлога з дошак. Далей у канец другі ПАКОЙ, да якога дзверы аднатыпныя, унутры тры вакны з чатырма пабітымі шыбамі, печ і камін, як у першым, столь і падлога такія ж, з яго дзверы да капліцы, футраваныя жалезнымі цвікамі. Рушыўшы з яго (пакою), ПАКОЙ спальны з альковам, дзверы да яго таго ж фасону, акно адно, печ кававая на два пакоі, падлога паркетная ў рамах дубовых, квадратамі пакладзеная, з яго да сенцаў другія (дзверы), з сенцаў да БАСТЫЁНУ дзверы адзінарныя, простыя, на завесах з зашчапкай і прабоямі, у ім два вялікія вакны без васьмі шыб і два меншыя вакны без шкла, камін кутавы, падлога з

цэглы. Вярнуўшыся назад, са спальнага (пакою) прама ПАКОЙ, дзверы такія ж, паркет у рамах дубовых, квадратная, невялікая, суфіт папраўлены, камін французскі (ad nermam ?), два вакны цэлыя. З яго (пакою) да сенцаў і з сенцаў да параднага ПАКОЮ двое дубовых дзвярэй, такіх жа і з аднастайным акуццем, як усюды, у ім тры вакны без двух шыб, печ у ім акруглая з белых кафляў, камін французскі, суфіт з французшчынай (ляпнінай), над камінам вызалачанай, у другім канцы печ з муру адным бокам з белых кафляў вызалачаных, паркет дубовы ў вялікіх табліцах у клетку выкладзены. Далей ПАКОЙ, да якога на ўваход і выхад, а таксама ў бок дзядзінцу трое дзвярэй аднаго фасону па ўзору першых, з замкамі бронзавымі папсутымі, без ключоў, печ кафельная з кафляў пазалочаных, акно адно з выбітай шыбай, паркет у рамах дубовых квадратны малы, суфіт з французшчынай пазалочаны, напалову (с. 8) ападлы. Пакой перад партрэтнай залай, у ім два вакны без 27 шыб, паркет малы дубовы, печ з кафляў кававых, суфіт з пазалочанай французшчынай, ападлы, з яго ўправа да пакою дзверы, як усюды. Заля ПАРТРЭТНАЯ, дзверы да яе такія ж, вокан у ёй шэсць, ва ўсіх шыбы пабітыя, толькі ў некаторых часткова засталося (шкло), паркет у ёй дубовы малы, печ з кафляў кававых з пазалотай, суфіт з пазалочанай французшчынай увесь паападаў. З кута залі БАСТЫЁН, да яго дзверы адзінарныя на завесах, у ім тры вакны без шкла. Вярнуўшыся назад, з залі да бакавых пакояў двое дзвярэй падвойных і трэцля, выходзячы назад к дзядзінцу, таго ж тыпу, як ва ўсіх пакоях, з залі ПАКОЙ, у якім два акны цалкам пабітыя. Выйшаўшы з залі, сені ВЯЛІКІЯ, у іх два каміны і кафельная печ, тры акны, шыбы ў іх выбітыя, з сяней далей ПАКОЙ, дзверы да яго аднатыпныя, з сапсутым замком і адной засоўкай, печ і камін не адрозніваюцца (ад іншых), два вакны выбітыя, памінуўшы яго (пакой), заля для ТАНЦАЎ, да яе дзверы падвойныя без замка, толькі з адной засоўкай, суфіт зусім асыпаўся, вокан у ёй дзевяць, усе без шкла, таксама і ў рагу чатыры, печ і камін аднастайнага фасону, з залі на галярэю дзверцы на завесах з кручком. Выходзячы з залі ПАКОЙ, дзверы да (яго) і з яго ўправа падвойныя, з замкамі, пры адных няма засоўкі. Печ і камін, два акны, у адным тры шыбы разбітыя, з таго ПАКОЮ двое дзвярэй на выхад і ўправа да сяней, з замкамі, пры іх адной засоўкі няма, печ і камін, як у іншых (пакоях). СЕНІ, у якіх два акны без шкла. Выходзячы з іх, ПАКОЙ, дзверы да ўваходу і ўправа да сяней двое дзвярэй з замкамі і толькі па адной засоўцы, печ і камін. Акно адно, без шкла. За ім далей ПАКОЙ, дзверы падвойныя, у іх адна створка без завеса. Замок сапсуты, печ і камін, дзверы з яго да сяней без замка, толькі з засоўкамі (с. 9), адно акно пабітае; выйшаўшы з таго пакою, памінуўшы ганак, увесь зруйнаваны, пакой СТАЛОВЫ, ці са звароту тая самая партрэтная заля, якая раней апісана, перад той залай КРЭДЭНС (буфет), з якога дзверы на ганак, печ і пры ёй камін цалкам зруйнаваныя, акно адно з дзвюма выбітымі шыбамі. За буфетам заля СТАЛОВАЯ, да яе дзверы з замком унутраным і засоўкамі, завес з

аднаго боку зламаны, печаў дзве, камін адзін, вокан чатыры, у іх сямнаццаць выбітых шыб, суфіт зусім апаў. Выходзячы з тых СЯНЕЙ, дзверы аднастайнай работы і акуцця, вокан два, таксама трэцяе акно над ўсходамі сеннымі, у тых трох вокнах дзве шыбы выбіты. Гэты ўвесь гмах замку накрыты дахоўкай, а стайня і вежа над брамай гонтамі...[15]. Далей ідзе апісанне італьянскага парку і забудовы ў ім. Мелася аранжарэя з фігарняй, у пераліку дрэў і кветак – апельсін, лімон, букшпан, кіпарыс, фікус... 20 кустоў вінаграду.

У 1792 г. мястэчка Мір і замак апекуном Даменіка, кашталянам віленскім Мацеем Радзівілам, быў аддадзены ў застаў Юзафу Вайніловічу. Вопіс 1805 г. сведчыць пра далейшае занядбанне замка, але архітэктурная структура яшчэ захавалася. На першым паверсе большых пакояў 4, меншых 2, складоў 12, кухня, пякарня, стайні 2, варыўня, склепаў мураваных 4 і меншых 4, лядоўня. На другім паверсе большых пакояў 8, меншых 4, скарбец, гардэробкаў малых 2, заля, пекарскі пакой, калідоры 4. Падлога ў 6 пакоях з дошак, у астатніх з цэглы. Печаў з зялёнай кафлі 13, адна цагляная, камінаў 13. Дзвярэй сталярных 22 і 7 звычайных. Усе памяшканні на абодвух паверхах са скляпеннямі. На трэцім паверсе: 2 калідоры з мураванымі галярэямі, 2 залы, пакояў вялікіх 8, меншых 4, а ў двух засталіся толькі сцены. У залах і 12 пакоях столі алебастравыя, па большай частцы паападалыя. Падлога ў 6 пакоях з дошак, а астатнія зусім без падлогі, паркету ўжо не было. *Партрэтаў вялікіх старых сапсаваных 16. Партрэтаў меншых цэлых у пакоях 6.* Вокнаў зашклёных, аднаго памеру 20. Два старыя куфры, абабітыя ласінай скурай і акаваныя жалезам, куфар драўляны з жалезнай акоўкай. Крэслаў старых неўжываных два, дыван на кроснах распачаты (!) [16].

У 1830 г. лаканічны вопіс камісіі па падзелу спадчыны Дамініка Радзівіла (1786–1813) малюе карціну гібелі замка. "Замак мірскі, калісьці жылы, у квадрат з чатырма па рагах бастыёнамі з цэглы на тры паверхі змураваны і абведзены вакол насыпаным з зямлі валам, цяпер цалкам закінуты і зруйнаваны і ледзьве ў чацвертай частцы дахоўкай накрыты. Адна частка квадрату да паловы амаль збіта, другая без крокваў і бэлек, рэшта без вокан, дзвярэй, столі, падлогі, печаў і г.д. Словам, для пражывання непрыгодны. У адным склепе гэтага замка знаходзіцца штук семсот дахоўкі пад наглядам вартаўніка Мікіты Бычкі... [17].

Некаторыя вывады з гісторыі Мірскага замка. Замак у часы Радзівілаў быў абжытым толькі ў пэўныя непрацяглыя перыяды. Ён увесь час заставаўся незакончаным. Так было ў часы Сіроткі і яго сына Аляксандра Людвіка (1594–1654), затраціўшы нямала сродкаў на будаўніцтва палаца, яны не паспелі аздобіць яго ўнутры, наўрад ці з'явіліся тут у гэты перыяд партрэты, або шыкоўная мэбля. Затым адбылося поўнае знішчэнне ў 1654 г. Толькі больш-менш кансервавалі замак Кацярына з Сабескіх і Караль Станіслаў (заўважым, што Пятра І ён прымаў у Карэлічах, а не ў Міры), шведы зноў яго

паляць. Без перабольшання можна сказаць, што Радзівілы ледзь паспявалі ставіць дахі і вокны. Упершыню некаторыя інтэр'еры набылі палацавы выгляд каля 1740 г. пры Ганне з Сангушкаў і Міхалу Казіміру Рыбаньку. З'яўляюцца некалькі залаў і пакояў на трэцім паверсе з паркетнай падлогай, філёнкавымі дзвярамі, алебастравая ляпніна плафонаў стылю ракако ("французшчына") з пазалотай, кафельныя печкі і каміны, партрэты. Але гэты апошні бляск меў кароткае жыццё – каля чвэрці веку, зусім нядоўга тут пасвяткаваў Пане Каханку. Яго выгнанне за мяжу трагічна адбілася на захаванасці замка, ужо ў 1780 годзе мы бачым карціну яго запусцення. Наўрад ці інтэр'еры замка пацярпелі значна ў паўстаннях і войнах 1794 і 1812 г., па сутнасці, рабаваць там ужо не было чаго.

---


1. AGAD, AR Dz. XXV, 2443, l. 2.
2. Калнін В. Мірскі замак. – Мн., 1997. – С. 78–79.
3. AGAD, AR Dz. XXV, 2444, l. 4–5.
4. AGAD, AR Dz. XXV, 2445.
5. AGAD, AR Dz. XXV, 2447.
6. Калнін В. Мірскі замак. – С. 84–85.
7. AGAD, AR Dz. XXV, 2443, l. 1–3.
8. AGAD, AR Dz. XXV, 2449.
9. AGAD, AR Dz. XXV, 2450, l. 1–2.
10. AGAD, AR Dz. XXV, 2451/1, l–2.
11. AGAD, AR Dz. XXV, 2443, l. 2.
12. Калнін В. Мірскі замак. – С. 93.
13. AGAD, AR Dz. XXV, 2453 і 2454.
14. AGAD, AR Dz. XXV, 2465. Syrokomla Wł. Wędrówki po moih niegdyś okolicach. – Wilno. 1857.
15. Waldemar Mikulski, Jarosław Zawadzki. Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dobr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłow w Archiwum Glównym Akt Dawnych. – Warszawa, 1999. – S. 46–51.
16. AGAD, AR Dz. XXV, 2455.
17. AGAD, AR, Dz. XXV, 2467, 3.